*Каліноўская А. Т.,*

наменік начальніка аддзела навукова-метадычнага забеспячэння дзейнасці па ахове гісторыка-культурнай спадчыны ДУА «Інстытут культуры Беларусі», кіраўнік танцавальнай групы «GUDA», старшыня аргкамітэта конкурсу выканаўцаў беларускага народнага танца «Мяцеліца»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ТРАДЫЦЫЙНЫЯ БЕЛАРУСКІЯ ТАНЦЫ: СПЕЦЫФІКА І АСАБЛІВАСЦІ ВЫКАНАННЯ

У багатай традыцыйнай культуры беларусаў аўтэнтычная харэаграфія займае адно з вядучых месцаў і характарызуецца высокай ступенню развіцця і захаванасці. Вывучэнне традыцыйных побытавых танцаў дае шырокія магчымасці для іх выкарыстання пры арганізацыі свят, вечарын, творчых заняткаў з дзецьмі і дарослымі. Танцавальная імпрэза арганічна аб’ядноўвае ўсе фальклорныя жанры: песню, музыку, танец, гульню.

Многія беларускія танцы патрабуюць пэўнага майстэрства, але шмат сярод іх і такіх, да якіх можна далучыць усіх жадаючых. На традыцыйных святах не было гледачоў, усе ў пэўны момант станавіліся іх удзельнікамі. Менавіта танец як супольнае мастацкае дзеянне дазваляў гэта зрабіць. Не кожны здольны да песні, прамовы, ігры на музычных інструментах, але існуе многа простых танцаў, для якіх дастаткова толькі стаць у круг, выканаць некалькі простых рухаў, каб адчуць сябе ўдзельнікам свята.

У многіх народаў ёсць танцы, якія з’яўляюцца агульнапрызнанымі, своеасаблівымі рэпрэзентантамі этнічнай культуры, культурнымі сімваламі. Сярод такіх танцаў у беларусаў найбольш вядомыя: «Лявоніха» і «Полька».

Сцэнічныя варыянты «Лявоніхі» не даюць уяўлення аб яе рэальнай значнасці ў аўтэнтычнай харэаграфіі беларусаў. «Лявоніха» ўваходзіць ва ўсе групы арнаментальных і імправізаваных танцаў. Шырока распаўсюджаны парныя варыянты з устойлівай кампазіцыяй і рэгламентаванай лексікай, але ў многіх рэгіёнах сустракаюцца і сольна-гуртавыя, дзе кожны з удзельнікаў, якія ўвесь час рухаюцца па кругу, па чарзе саліруе ў цэнтры са сваёй імправізацыяй і прыпеўкамі. Вялікую цікавасць уяўляюць абрадавыя варыянты «Лявоніхі», прымеркаваныя да вяселля. На Палессі атрымаў распаўсюджанне гэты танец «тройкамі».

Беларуская полька мае выразны і адметны стыль, для якога характэрны асаблівая эмацыянальная яскравасць, імклівы тэмп, адточанасць і тэхнічнасць выканання рухаў, асабліва рухаў ног і разнастайных кручэнняў. Па тыпу кампазіцыі вылучаюцца дзве асноўныя групы полек: парныя імправізаваныя

мала- і шматфігурныя; парна-гуртавыя шматфігурныя і шматкаленныя. У парных польках структура танца імправізуецца партнёрам, у парна-гуртавых — вядучым. Апошні складае кампазіцыю з набору пэўных фігур («кола», «ручаёк», «качан», «кошык» і інш.), паслядоўнасць якіх вызначае па ўласнаму жаданню. У параўнанні з іншымі танцамі польцы найбольш уласцівы дух спаборніцтва і імкненне прадэманстраваць майстэрства, што патрабуе добрай фізічнай падрыхтоўкі і вынослівасці.

Асаблівы статус гэтых танцаў падкрэсліваецца і тым, што з іх, як правіла, пачынаюцца вясковыя вечарыны і імі ж завяршаюцца, гэта абавязковыя танцы на традыцыйным вяселлі.

На народных танцавальных вечарынах прынята было прытрымлівацца пэўнага этыкету. Напрыклад, каб запрасіць дзяўчыну на танец, хлопец падыходзіць і схіляецца да яе, толькі тады яна ўстае і дае руку. Пасля танца кавалер павінен адвесці партнёрку на яе месца. Не было заведзена, каб дзяўчына танцавала без хлопца. Дзяўчаты стараліся не адмаўляць хлопцам у танцы, але паводзілі сябе так, каб не даваць хлопцам заляцацца на людзях. Гэта было тым больш важна, што на вечарыны часта прыходзілі бацькі маладых танцораў.

Сярод побытавых танцаў пераважаюць парныя, але, каб заахвоціць удзельнікаў, далучыць пачаткоўцаў, арганізоўваюцца танцы-гульні, гуртавыя танцы, танцы са зменай пар. Шмат беларускіх традыцыйных танцаў, гульняў, карагодаў падрабязна апісана ў 6-томным выданні «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў» (2001—2013), кожны том якога прысвечаны асобнаму рэгіёну Беларусі.

Праграма практычнага занятку

| Групы танцаў | Танцы для вывучэння (паходжанне танцаў) | Спасылка на ўзор выканання ці апісанне танца |
|---|---|---|
| Парна-гуртавыя | «Полька» з камандамі (в. Мётча, Барысаўскі р-н, Мінская вобл.) | Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. — Т. 5: Цэнтральная Беларусь. — Кн. 2. — Мінск: Выш. шк., 2011 |
| | «Грэчанікі» (г. Давыд-Гарадок Столінскі р-н, Брэсцкая вобл.) | Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. — Т. 4: Брэсцкае Палессе. — Кн. 2. — Мінск: Выш. шк., 2009 |
| Гуртавыя | «Лапці» (в. Целепуны, цяпер мікрараён г. Мазыр; танец рэстаўрыраваны М. Козенкам) | https://www.youtube.com/watch?t=23&v=RYS2uFeM7dE |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| Групы танцаў | Танцы для вывучэння (паходжанне танцаў) | Спасылка на ўзор выканання ці апісанне танца |
|---|---|---|
| Танцы са зме-най пар | «Падыспань» з пераходамі (пашыраны па ўсёй Беларусі) | https://www.youtube.com/watch?v=bjgVP0PkoOs#t=48 |
| | «Яблычка» (Любанскі р-н, Мінская вобл.) | https://www.youtube.com/watch?v=7ELbVGqChmg |
| Танцы ў тройках | «Лявоніха» тройкамі (в. Чырвоная Слабада, Акцябрскі р-н; в. Дарасіно, Любанскі р-н) | https://www.youtube.com/watch?v=LfTsB9b8eqE, |
| | «На рэчаньку» тройкамі (в. Завалы, Барысаўскі р-н, Мінская вобл.) | https://www.youtube.com/watch?v=2GOjrt0z4zc#t=13 |
| Парныя танцы | «Лявоніха» (Петрыкаўскі р-н, Гомельская вобл.) | https://www.youtube.com/watch?v=GfOkkJ5cATg |
| | «Грачанікі» (в. Зімовішчы, Мазырскі р-н, Гомельская вобл.) | https://www.youtube.com/watch?v=gc1b9BBRtLo |
| Танцы-гульні | «Юрачка», «Явар» (пашыраны па ўсёй Беларусі) | https://www.youtube.com/watch?v=IoaxafNsQJs |

Некаторыя танцы, карагоды, гульні ўзяты пад ахову дзяржавай. На сайце «Жывая спадчына Беларусі» (http://livingheritage.by/) размешчаны Інвентар нематэрыяльнай культурнай спадчыны, які ўяўляе сабой базу даных элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны, уключаных у Спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, а таксама тых, якія гэты статус яшчэ атрымаюць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ